№ 139 (1204)

Чацвер, 2 жніўня 2001 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць —
5 разоў у тыдзень

Кошт: у кіёсках і крамах — 100 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

*На прастор, на шырокі разлог*
*Выхадзі, мой народ, грамадою...*
**Якуб Колас**

# Народная Воля

**Надвор'е**

Сёння ўдзень па краіне чакаецца пераменная воблачнасць, пераважна без ападкаў. Вецер няўстойлівы, слабы. Тэмпература паветра ўначы — +9...+14, удзень — +20...+25.

Пейджинговую связь редакции обеспечивает
МОБИЛКОМ
пейджинг-система
(017) 222-46-51
(017) 222-46-52

**Позавчера Александр Лукашенко сказал, что в случае необходимости его будут защищать внутренние войска и в первую очередь СОБР (Специальный отряд быстрого реагирования) под командованием Д.Павлюченко, который, как известно, был арестован и водворен в одну из камер следственного изолятора КГБ, но вырван был оттуда по личному указанию Лукашенко.**

**Почему А.Лукашенко не сказал своей вертикали и всему белорусскому народу, что он грубейшим образом нарушил Конституцию и все законы, запрещающие главе государства подменять прокуроров, следователей, судей. Кстати, как подтверждают достоверные источники, по документам об аресте Д.Павлюченко, он и по сегодняшний день сидит в следственном изоляторе.**

**В какой другой стране такое может быть?**

ДОСЛОВНО

## ПОНЕСЛО...

**Агентство "Ю.С.Ньюс"**

Представителю ПАСЕ уже в первый вечер нахождения в Минске пришлось испить горькую чашу, преподнесенную главой государства с телеэкрана.

Глава делегации Парламентской ассамблеи Совета Европы Тэрри Дэвис в 21 час во вторник увидел вместо "Панорамы" получасовую агитацию из уст самого Александра Лукашенко, которую правильнее было бы охарактеризовать как предвыборную агитацию.

Что же делает Лукашенко, пока не приехали наблюдатели от варшавского бюро ОБСЕ?

**Ограничивает право граждан на информацию**

"Пока на информационном поле идет информационная война", — сказал А.Лукашенко.

"Насколько это возможно, я пытаюсь локализовать ее в рамках Минска и не дать возможность расползтись этой заразе по всей стране".

**Якобы знает о подкупе сборщиков подписей**

"Все очень просто: деньги получили в центре - центральные штабы, — деньги поделили, пропили, и людям на местах, которые собирали подписи, денег не дали. И люди, которые за них собирали подписи — очень много фактов, вы их знаете, лучше чем я, — которым пообещали деньги, они собрали подписи, — они их не сдали на проверку, потому что деньги не отдали".

**Признает, что местные власти работают только на его переизбрание**

"Они же прекрасно понимают, что выборы действующего президента организовывает вертикаль власти. Это ни для кого не является секретом".

**Шпионит за конкурентами**

"Посол Беларуси Маринич в беседе с представительными западными экспертами одной из стран западных сообщил следующее. Маринич выдвинул свою кандидатуру по предложению коалиции "За новую Беларусь", а не по собственной инициативе".

**Объясняет, что же удерживает его от арестов**

"Сразу же на месте реакция - наверное, не совсем в порядке что-то с президентом. Подтверждается тот тезис, о котором-де писали: на генном уровне больной, нездоровый, и т.д., и т.п."

**Не хочет, чтобы опять были задействованы "эскадроны смерти"**

"Скажите, а кто будет арестовывать? Опять эскадроны смерти и их руководители. Опять Шейман, опять Сиваков, опять Павлюченко, опять Наумов, опять Ерин, опять силовики. Ход далекий..."

**Повышает Вика до начштаба и главы всей ОБСЕ**

"Выборы пройдут. 10 сентября приходит. Объявляются результаты. Действия оппозиции? Они сегодня прогнозируются. Начальником штаба всей оппозиции стал Вик — руководитель ОБСЕ. Это штаб, где действует, куда стекается вся информация".

**Ловит сетью американцев и журналистов**

"Создана сеть. Я вот видел по Кричеву, по другим городам — по-моему, по Осиповичам или Бобруйску. Мы нащупали эти компьютерную связь — собственность США. Поставлены американцами через посольство американское компьютеры, установлены в каждом районе. В момент выборов 15—17 тысяч наблюдателей, которые они хотят собрать, на выходе — это югославский сценарий — опрашивают избирателей: "Вы за кого? За того? За того?" - неважно, что они скажут. К моменту закрытия участковых избирательных комиссий по компьютерной связи, коммуникационной связи информация сбрасывается в несколько центров. Там сидят журналисты — наши, и оппозиционные, и зарубежные — их будет немало. По крайней мере, по нашим расчетам около 250 человек только зарубежных аккредитуется. Они сразу же дают эту информацию — якобы правильную — во все каналы: BBC, CNN, Euronews, российские каналы и т.д. и т.д. Так было в Югославии. Эту информацию получают все западные руководители. До начала подсчета официального, законного голосов объявляется некий белорусский Коштуница".

**Прогнозирует захват своей резиденции**

"10 сентября - естественно, выборы, они считают, будет объявлен победитель Лукашенко — не согласные с этим не менее 10 тысяч человек только с регионов своятся к резиденции президента, плюс зеваки и **интересующие,** плюс еще кто-то — создается массовость, атакуется резиденция президента, как в Югославии захватывается и объявляется белорусский Коштуница. Не будет Коштуницы в Беларуси! Не будет! Это должны знать вы и все, кто на это рассчитывает".

**Обещает не быть Милошевичем...**

"Они прекрасно знают, что я буду защищаться. Я в бункере сидеть, как Милошевич, не буду. Я никого не боюсь, я ничего не украл у своего народа. И я буду защищаться. Кто будет защищать? Армия — во внутренние дела не привлечешь. Вмешиваться она не будет. Конечно, внутренние войска. Во внутренних войсках есть специальная бригада спецназовская под командованием Павлюченко. Фамилия вам известная".

**...И защититься с помощью Павлюченко**

"Я не могу в адрес этой бригады бросить ни одного камня. Когда атаковали и показывали по телевидению вот эти кадры, когда мостовую ломали вот здесь под боком у президента резиденции, это эта бригада нейтрализовала этих негодяев. Эта бригада как бельмо на глазу сегодня у оппозиции. Они прекрасно просчитывают, что спецподразделения "Альфа", "Алмаз" и эта бригада будет защищать президента и никогда не сдаст".

**Следит за тремя экс-прокурорами**

"В ближайшее время, я так думаю, вытащат Божелко. Ищут его - тот спрятался, — чтобы дал интервью против власти. Потому что Титенков отработан, прокуроры, которые сбежали, отработаны, работают дворниками в США, по-моему, что, кстати, удивило жен, которые там побыли. Дворниками! Они уже отыграли свое, зарабатывают себе на хлеб и очень недовольны своим положением".

**Признает, что вертикаль думает о его конце**

"Я оправдываться ни перед кем не намерен. И моя когда-то президентская жизнь закончится. И я об этом тоже думаю. Как и все вы. И мне сегодня идти на малейшие правонарушения — это значит в будущем нести за это ответственность. Но вы должны знать твердую и непоколебимую мою позицию: президентские выборы — эти — я выиграю. С вами это будет - я бы этого хотел - или без вас, но я их выиграю. И я никого не боюсь".

**Призывает отказаться от чистых методов борьбы**

"И имейте в виду: история свидетельствует о том, что в белых перчатках власть не отстаивают. И власть та чего-то стоит, если она может хотя бы себя защитить. Если она себя не может защитить, она никогда государство не защитит".

СЛОВО К НАРОДУ

## Страх лишил их разума

**Вчера, выступая на совещании перед представителями исполнительной власти, президент Лукашенко четко обозначил свой сценарий проведения грядущих президентских выборов. Стало очевидно, что ставка нынешнего главы государства сделана на силовое удержание власти. Действующий президент недвусмысленно заявил, что ни при каких обстоятельствах не отдаст власть. Документы следствия, в которых говорится о причастности должностных лиц государства к физическому уничтожению политических оппонентов, не принимаются им во внимание. Президент, как гарант прав и свобод граждан Беларуси, не собирается проводить независимое расследование и отстранять чиновников, замешанных в этих преступлениях. Потому что нынешняя власть рассчитывает только на личную преданность отдельных силовиков. Спецподразделения призваны стать опорой Лукашенко на выборах.**

**Власть, бравируя тем, что у нас нет войны, национальной и религиозной розни, собирается ввергнуть общество в гражданскую бойню. Жители Беларуси хотят строить открытое демократическое общество. Жива память войны с фашизмом, с гитлеровской диктатурой. И мы знаем, чем все это закончилось. Поэтому и сегодня ни "эскадрон смерти", ни спецназ не должны решать личных проблем нынешнего авторитарного президента.**

**Мы выступаем за проведение честных, прозрачных выборов. Выбирать президента должен белорусский народ, а не лично преданные власти бойцы из спецподразделений. Вместе мы не позволим расколоть общество и вести страну по пути смуты и хаоса. Уверены, что здравый смысл восторжествует, и граждане Беларуси смогут открыто и осознанно сделать свой выбор в пользу своего будущего — стабильного и предсказуемого.**

**В.ГОНЧАРИК, С.ДОМАШ, С.КАЛЯКИН, П.КОЗЛОВСКИЙ, М.ЧИГИРЬ, М.МАРИНИЧ.**

*1.08.2001 г.*

РАСЛЕДАВАННІ

## Алег Алкаеў знаходзіцца далёка ад Мінска

Былы начальнік следчага ізалятара ГУУС Мінгарвыканкама, а цяпер — намеснік начальніка Камітэта па выкананні пакаранняў МУС Алег Алкаеў, магчыма, знаходзіцца за мяжой, у адной з заходніх краін. Пра гэта БелаПАН паведаміў кіраўнік грамадскага аб'яднання "Прававая дапамога насельніцтву" Алег Волчак.

Паводле яго слоў, члены грамадскай камісіі па расследаванні знікнення вядомых на Беларусі людзей адразу ж пасля абнародавання дакументаў аб прыналежнасці да гэтых выкраданняў кіраўнікоў шэрагу сілавых ведамстваў і іх падраздзяленняў спрабавалі выйсці на А.Алкаева і ўстанавілі, што ў Мінску яго няма. Спачатку з'явілася інфармацыя пра тое, што ён знаходзіцца ў Маскве, а пасля — пра тое, што ён, магчыма, выехаў за межы СНД. На думку А.Волчака, хутка А.Алкаеў мусіць выступіць з пацвярджэннем тых выкрывальных дакументаў. Як лічыць А.Волчак, ад'езд А.Алкаева выклікаць тым, што на яго спрабавалі выйсці супрацоўнікі прэзідэнцкіх спецслужбаў, каб прымусіць яго выступіць з абвяржэннем апублікаваных дакументаў.

Нагадаем, што сярод гэтых дакументаў прысутнічае рапарт А.Алкаева на імя міністра ўнутраных спраў Уладзіміра Навумава, а таксама пратакол яго допыту намеснікам начальніка аддзела пракуратуры Рэспублікі Беларусь Я.Казаковым. У іх, у прыватнасці, гаворыцца пра тое, што па асабістым ўказанні былога міністра ўнутраных спраў Юрыя Сівакова адмысловы пісталет з глушыцелем, якім прыводзяцца ў выкананне смяротныя прыгаворы, выдаваўся асобам, што не маюць адносін да спецыяльнай групы па прывядзенні такіх прыгавораў у выкананне. Зброя выдавалася быццам бы для правядзення вучэбна-трэніровачных стрэльбаў. Разам з тым яго выдача супадае з датамі знікнення Юрыя Захаранкі (знік 7 мая 1999 года), Віктара Ганчара і Анатоля Красоўскага (16 верасня 1999 года).

Акрамя таго, у паказаннях А.Алкаева гаворыцца пра прысутнасць падчас выканання смяротнага прыгавора камандзіра Спецыяльнага атрада хуткага рэагавання (САХР) МУС Дзмітрыя Паўлючэнкі, чыя прыналежнасць да знікнення апазіцыйных палітыкаў таксама ўказваецца ў дакументах. Хаця прысутнасць пабочных асоб падчас растрэлу выключаецца, яна зрабілася магчымай па патрабаванні міністра ўнутраных спраў Ю.Сівакова.

**Генадзь БАРБАРЫЧ, БелаПАН.**

ЧУЛІ?

## У.Ганчарык абяцае з'яўленне новых дакументаў і асобаў у справе знікнення людзей

Уладзімір Ганчарык заявіў "Радыё Рацыя", што зараз ствараецца міжнародная камісія, якая будзе расследаваць факты знікнення палітычных апанентаў Аляксандра Лукашэнкі. Адказу з адміністрацыі кіраўніка дзяржавы, куды былі перададзены дакументы пра дачыненне ўладаў да існавання ў Беларусі "эскадрону смерці", адзіны кандыдат ад дэмакратычных сілаў так і не дачакаўся. У самой адміністрацыі заяўляюць, што пісьмовага адказу і не будзе, бо Аляксандр Лукашэнка ўжо выказаўся на гэтую тэму.

**RR:** — Ці можна чакаць бліжэйшым часам з'яўлення іншых дакументаў у справе знікнення людзей?

**У.Г.:** — Так. Магу сказаць, што так. Не толькі з'яўленне новых матэрыялаў, але і новых асобаў.

**RR:** — Каго Вы маеце на ўвазе?

**У.Г.:** — Бліжэйшым часам убачыце.

**Юрась КАРМАНАЎ.**

Вы еще не посетили наш сайт?
http://nv.promedia.minsk.by

АКЦЫІ

## Моладзь малюе будучыню

Днямі ў Бабруйску на пляцоўцы каля ДК "Шыннік" маладыя сацыял-дэмакраты са згоды гарвыканкама арганізавалі творчы конкурс малюнкаў на асфальце пад назвай "Выбірай". "Выбары ў маім жыцці. Погляд у будучыню" - так была сфармулявана тэма конкурсу, у якім прынялі ўдзел хлопцы і дзяўчаты ва ўзросце да 19 гадоў. У больш старэйшых удзельнікаў конкурсу назіралася тэндэнцыя бачыць будучыню ў бел-чырвона-белых колерах. Дзеці малявалі сябе, сваю сям'ю, свой дом, вуліцу. Але, як кажуць сведкі, "нязменным было сонца, якое прабівалася праз шэрыя хмары, асвятляючы твары людзей шчырай надзеяй".

Журы вызначыла пераможцаў, якія атрымалі падарункі. Мерапрыемства прайшло весела, у добрым настроі. Шкада толькі, што пасля яго заканчэння, хвілін праз дзесяць, пайшоў моцны дождж і змыў з асфальту надзеі юнакоў.

**Алесь СІЛІЧ.**

## "Зубр" проводит урок истории

Активисты незарегистрированного молодежного движения сопротивления "Зубр" раздали книги по белорусской истории работникам милиции. В каждый РОВД Минска симпатичные девушки в майках с логотипом движения и надписью "Время выбирать" передали несколько книг Владимира Орлова и Геннадия Сагановича "Десять веков белорусской истории", изданных специально для этого на русском языке. На каждом из 72-х экземпляров была наклейка "Зубр". Сотрудники милиции охотно принимали книги.

Цель этой акции — устранение атмосферы противостояния между милицией и молодежью. Возможно, если милиционеры будут знать белорусскую историю, им легче будет понять, за что борется молодежь, а также сделать правильный выбор и не допустить того, чтобы события, произошедшие 27 июля, повторились.

**Алесь БЕРКУТ.**

Размещая рекламу на страницах "Народной воли", Вы не только укрепляете свой бизнес, но и строите новую Беларусь!

НЕЗАЛЕЖНАЯ ЭКСПЕРТЫЗА

*Уладзімір КУЛАЖАНКА, доктар эканамічных навук, прафесар*

## Інфляцыя абяцанняў

Чым бліжэй дата прэзідэнцкіх выбараў, тым больш актыўнай становіцца папулісцкая палітыка А.Лукашэнкі. Абяцанні, вялікія і так сабе, сыплюцца нібы з якога напханага меха. Пішуцца ўказы, даюцца распараджэнні. Калі пільна паглядзець на іх змест і накіраванасць, то не цяжка заўважыць іх дыферэнцыяцыю — разлік на ўсе пласты насельніцтва.

Так, вядома, што актыўная частка насельніцтва, тыя, што кіруюць вытворчасцю і працуюць у рэальным сектары, незадаволены бесперспектыўнай эканамічнай палітыкай. Каб супакоіць гэтую незадаволенасць (пра мэту можна не гаварыць — яна вядомая), не далей як 12 ліпеня, падчас нібы планавага візіту на Мінскі трактарны завод, А.Лукашэнка афіцыйна абвясціў аб блізкай у рэспубліцы вельмі буйной лібералізацыі эканомікі, лічы эканамічнай рэформе. "Мы распрыгонім чалавека, — падкрэсліў А.Лукашэнка, — мы прадаставім суб'ектам гаспадарання вялікую самастойнасць і вызначым тыя накірункі, за якія я буду патрабаваць у кіраўнікоў". Па-першае, А.Лукашэнка бачыць і лічыць прэзідэнтам толькі сябе. Гэта ўсім зразумела. А па-другое, ён плануе такую лібералізацыю эканомікі, калі патрабаваць ад усіх, так званых распрыгоненых суб'ектаў гаспадарання, будзе не рынак, не рынкавы механізм, а ён, прэзідэнт. Зразумела, што лібералізацыя будзе не рынкавая, а каманда — адміністрацыйная. Карысці краіне і яе народу яна не дасць.

Каб залагодзіць актыўную частку працуючых, галоўны адміністратар выкарыстаў яшчэ адзін, на яго думку, актыўны крок. Ён выдаў чарговы Указ № 379 (13 ліпеня) "Аб мерах дзяржаўнай падтрымкі прамысловых прадпрыемстваў". І што гэта за падтрымка? 86 дзяржаўных горадаўтваральных прадпрыемстваў атрымалі на паўгода, год і паўтара года адтэрміноўку па ўплаце запазычанасці па плацяжах у дзяржаўныя і мэтавыя бюджэты. Заўважым, што адтэрміноўка датычыцца тых прадпрыемстваў, якія ўжо запазычыліся, не маюць грошай плаціць падаткі. Калі сур'ёзна гаварыць, то наўрад ці ім гэта дапаможа, бо праз 6 месяцаў альбо год усё роўна павінны плаціць. А за гэты кароткі час яны не здолеюць аздаравіцца. Таму трэба было спісаць запазычанасць, а не толькі адтэрмінаваць яе.

Зразумела, рыхтуючыся да выбараў, А.Лукашэнка не мог забыцца пра свой надзейны электарат — пенсіянераў. Тут дыферэнцыйны падыход спрацаваў як найлепей. Ён падпісаў адмысловы Закон "Аб унясенні змен і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь "Аб ветэранах". Апублікаваны закон здзіўляе сваімі памерамі (на некалькі газетных старонак), а таксама падрабязным апісаннем усіх катэгорый ветэранаў працы і войнаў. Дэталізаваны ільготы ад праязных білетаў у гарадскім транспарце да платы за тэлефон і камунальныя паслугі. Падтэкст гэтага закона такі: глядзіце, ветэраны, правільна галасуйце на прэзідэнцкіх выбарах. Калі памыліцеся, то скаргу майце толькі на сябе. Маўляў, калі прэзідэнтам будзе абраны не ён, то пенсіянеры і ветэраны апынуцца пры разбітым карыце. Канечне, гэта зусім не так. Пры такім карыце, калі непераадолены крызіс эканомікі, яны знаходзяцца ўжо зараз. Невыпадкова А.Лукашэнка нідзе не згадвае, за які кошт будуць аплачвацца абяцаныя прэферэнцыі інвалідам ды ветэранам. Таму выглядае ўсё гэта як чыстая інфляцыя абяцанняў. Да інфляцыі грошай мы ўжо прывыклі. Калі не прымем правільнага рашэння на выбарах, то давядзецца і далей перажываць інфляцыю абяцанняў.

Тым больш што эмісія абяцанняў прадаўжаецца. Не забыўся А.Лукашэнка і пра слабае звяно ў сваім электараце, пра моладзь. На адмысловай нарадзе супрацоўнікаў вышэйшай школы ён нядаўна заявіў, што трэба выплачваць стыпендыі таксама і студэнтам недзяржаўных вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. Толькі засталося невядомым, за які кошт: ці то за кошт бацькоў, якія павінны плаціць болей за навучанне, ці то за кошт бюджэту? Але ці вытрымае такую нагрузку бюджэт? Адным словам, успленск таннага папулізму і не больш! А вось што датычыцца палажэння аб стыпендыях прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, так бы мовіць, імянных стыпендыях, то тут А.Лукашэнка з вядомай мэтай, як кажуць, не паскупіўся. Выдаў адмысловы ўказ № 402 ад 19 ліпеня 2001 года "Аб увядзенні змянення ва ўказ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 жніўня 1996 года", дзе ў 1-м пункце запісана: "Памер стыпендый складзе 65.000 рублёў". Маўляў, ведайце, студэнты, хто мае пра вас клопат. Такое рашэнне варта адобрыць, але абавязкова нагадаць, што гэта народныя грошы і клопат пра моладзь народны, а не чыноўніка.

Калі А.Лукашэнка такі дабрадзей і апякун над народам, то чаму да гэтага часу ён не павысіў дапамогу па беспрацоўю, чаму дзесяткам тысяч людзей, бацькам і маці дзяцей ён плаціў кампенсацыю па беспрацоўю да апошняга чарговага павышэння заработнай платы, смех і грэх сказаць, толькі 7,230 рублёў у месяц. Гэта ж здзек над людзьмі!

Але абяцанні, якімі б прывабнымі ні былі, ва ўмовах іх нястрымнай інфляцыі мала чаго варты. Гэта відаць на прыкладзе спраўджання абяцання павысіць сёлета заработную плату бюджэтнікам да 100 долараў у месяц. Дзесьці 70 долараў на сёння ўжо ёсць, а вось набраць яшчэ па 30 долараў не атрымліваецца, бо пусты бюджэт і трашчаць па ўсіх швах прагнозныя паказчыкі росту ВУП, прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі. Пэўна, засталася ў А.Лукашэнкі адзіная крыніца "павышэння" дабрабыту людзей — эмісія грошай. Несумненна, што гэтая "крыніца" якраз і будзе скарыстана, хоць тут варта згадаць народную прымаўку: "Да пары збан ваду носіць".

## Штудман расчараваны...

Улады Беларусі паведамілі Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека (БДІПЧ) АБСЕ аб неабходнасці адкласці місію, якая павінна была прыбыць у Беларусь 1 жніўня для назірання за выбарчай кампаніяй. Планавалася, у прыватнасці, што місія будзе назіраць за рэгістрацыяй кандыдатаў у прэзідэнты.

"Я вельмі расчараваны гэтым рашэннем", — заявіў дырэктар БДІПЧ Герард Штудман. — Кожны дзень, на які адкладаецца наш прыезд, змяншае нашую здольнасць праводзіць прафесійнае назіранне, якое мы праводзім у іншых краінах АБСЕ".

**Аляксей ЗНАТКЕВІЧ.**

ПЕРЕКРЕСТНЫЙ ОГОНЬ

**А.ЛУКАШЕНКО:**

***"Оппозиционеры уже два года носятся с этими пропавшими... Они туда** (надо полагать, в список пропавших, — **Ред.**) **записали Геннадия Карпенко. Что, он также пропал? Человек умер, которого спасал лучший у нас хирург, спасал трое суток. Мясникович отвечал за это.***

***Когда умер Карпенко — я уже вам откровенно скажу — МЫ его хоронили. Жена пришла, говорит, ботинок нет, нет одеть во что и прочее... Вот он** (надо полагать, Мясникович, — **Ред.**) **ходил, покупал ему одежду. Мы по-человечески все сделали. При чем же здесь власть?"***

*Людмила КАРПЕНКО:*

## "Это циничная ложь..."

— Нас обливали грязью при жизни Гены, продолжается это и сейчас, — говорит Людмила Филипповна. — Это циничная ложь.

Действительно, нам звонил Мясникович. Приходил Титенков. Но я об этом узнала уже после похорон. Тогда мне было не до этих людей...

Мясникович для Карпенко одежду выбирал? Пусть назовет хотя бы размер "ботинок", которые они ему якобы покупали! Да я бы лучше умерла, чем пошла к этим людям! И гроб я сама выбирала, и место на кладбище...

Допустим, что такая ситуация действительно была бы: неужели Лукашенко не стыдно, что при его власти член-корреспондент Академии наук не может купить себе приличный костюм или ботинки?

Была создана комиссия по похоронам Карпенко. Я всех, в том числе и Михаила Мясниковича, просила об одном: чтобы Гену похоронили на Московском кладбище.

После похорон Юрий Захаренко сказал: они готовы всех нас похоронить. Сегодня я могу заявить то же самое.

Все эти высказывания — просто панический страх. Лукашенко боится проиграть выборы. Боится отвечать за убийства. Боится мертвых — ведь рано или поздно за все придется отвечать...

Вся эта клевета — лишь защитная реакция. Ему невыгодно избавляться от людей, которых публично обвиняют в убийствах. Сдаст Шеймана, Сивакова, Павлюченко и прочих — подпишет себе смертный приговор.

Омерзительно, стыдно и противно, что у нас такой президент.

Жены пропавших сегодня объединились. И как нас ни стараются рассорить — ничего не получится. Нас объединяет Беда. Я не сомневаюсь, что власти причастны к возможным убийствам Захаренко, Гончара, Красовского и Завадского. И не верю, что мой муж умер своей смертью...

**Марина КОКТЫШ.**

RADIO FREE EUROPE · RADIO LIBERTY

БЕЛАРУСКАЯ СЛУЖБА РАДЫЁ СВАБОДА

Новыя хвалі. Новы час. Нязменная Свабода

Ад 6 жніўня 2001 года Беларуская служба Радыё Свабода гучыць у эфіры ад 6-ай вечара да апоўначы

| Час | K/HZ | Хвалі |
|---|---|---|
| 18.00—24.00 | 7295, 7190 | 41 |
| | 11725, 11730, 11865 | 25 |
| | 15480, 15565 | 19 |
| | 9530, 9750 | 31 |
| 06.00—08.00 | 6170 | 49 |
| | 7295 | 41 |
| | 9635 | 31 |

Сталыя частоты на сярэдніх хвалях — 612 кілагерцаў

Беларусь, Менск, 220005 п/с 111
Чэхія, 11000 Прага, Вінаградска, 1
Інтэрнэт www/svaboda.org

Народная Воля
2 ЖНІЎНЯ 2001 г.

ПУЛЬС

## Тэрмін перарэгістрацыі суб'ектаў гаспадарання прадоўжаны да 1 ліпеня 2002 года

Лукашэнка падпісаў дэкрэт аб прадоўжанні тэрміну перарэгістрацыі суб'ектаў гаспадарання ў Беларусі да 1 ліпеня 2002 года. У адпаведнасці з дакументам, Савету Міністраў даручана да 1 лістапада гэтага года ўнесці прапановы па спрошчанні рэгістрацыйных працэдур і стварэнні ўмоў для актывізацыі прадпрымальніцкай і інвестыцыйнай актыўнасці.

У Беларускай канфедэрацыі прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў і Беларускай навукова-прамысловай асацыяцыі лічаць "падобнае рашэнне слушным, хаця і палавінчатым" і выказваюць "стрыманы аптымізм" у адносінах да далейшай лібералізацыі працэсу рэгістрацыі.

**Ірына САЗАНОВІЧ.**

## Выпушчана марка ў гонар Марка Шагала

Віцебскім краязнаўчым фондам імя А.Сапунова выпушчаны немаркіраваны канверт і сувенірная (непаштовая) марка ў гонар Марка Шагала. На канверце размешчана мініяцюрная рэпрадукцыя карціны М.Шагала "Сіні дом у Віцебску", на марцы — фотаздымак мастака і надпіс: "Марк Шагал.1887 — 1985.Віцебск.2001".

**Леанід СІМАНАЎ.**

## Зноў узраслі тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі

На 0,8 працэнта павялічылася квартплата (тэхабслугоўванне) і плата за карыстанне ліфтам, на столькі ж падаражэлі газ, халодная вада і каналізацыя, вываз і абясшкоджванне адходаў, на 35 працэнтаў — гарачая вада.

З пачатку года плата за карыстанне ліфтам узрасла на 25,6 працэнта, квартплата (тэхабслугоўванне ) — на 25,7, плата за карыстанне радыёкропкай — на 32,4, халодная вада і каналізацыя — на 58,5, газ — на 64,6, вываз адходаў — на 76,5, абясшкоджванне адходаў — на 77,1 працэнт, гарачая вада — у 2,2 раза.

**Дзмітрый УЛАСАЎ.**

## Адкрылася выстава шведскіх мастакоў і фатографаў

Шведскія майстры ўпершыню выстаўляюць свае працы ў Мінску. Яны прыбылі ў беларускую сталіцу па запрашэнні Міжнароднай гільдыі жывапісцаў. Таксама гэтая выстава з'яўляецца часткай праекта Галіны Еўдакімчыкавай і Ларса Ёрана Малмгвіста, якія актыўна падтрыманы Шведскім інстытутам. У межах праекта ў Швецыі прайшлі ўжо тры выставы беларускіх мастакоў.

На выставе, якая пройдзе да 10 жніўня, прадстаўлены творчыя працы шведскіх майстроў: мастацкая фатаграфія, жывапіс, металапластыка, роспіс па тканіне, скульптуры і кампазіцыі з каменя і дрэва.

**Маша ПЯТРОВА.**

## Платныя паслугі падаражэлі больш чым на 40 працэнтаў

За першае паўгоддзе 2001 года платныя паслугі насельніцтву падаражэлі на 41,1 працэнта, што складае 6 працэнтаў у сярэднім за месяц.

Паводле звестак, Міністэрства статыстыкі і аналізу Беларусі, найбольш значна павялічыўся кошт паслуг прававога характару і дашкольных устаноў (у 1,6 раза), жыллёва-камунальный гаспадаркі (на 49,5 працэнта), гасцінічнай гаспадаркі(на 45,1 працэнта), санаторна-курортныя (на 43,6) і турысцка-экскурсійныя (на 41,4) паслугі. Тарыфы на карыстанне пасажырскім транспартам узраслі на 35,4 працэнта (у тым ліку гарадскім — на 51,8, прыгарадным чыгуначным — на 50), плата за адукацыю — у 1,5 раза.

У першым паўгоддзі харчовыя тавары падаражэлі ў сярэднім на 21,7 працэнта. Найбольшы рост цэнаў зафіксаваны на гародніну (на 74,2 працэнта), цвёрдыя сыры (на 38,8), бульбу (на 35,3), малако і малочныя прадукты (на 31,2), алкагольныя напоі (на 24,7). Цэны на прадпрыемствах грамадскага харчавання ўзраслі за паўгоддзе на 46,4 працэнта (на 6,5 працэнта ў сярэднім за месяц).

**Дзмітрый УЛАСАЎ.**

*Падчас жніва механізатарам саўгаса Копцеўка Горацкага раёна даводзіцца абедаць непасрэдна ў полі. Адпачыць можна будзе пазней, калі свірны напоўняцца залацістым зернем.*

**Фота IREX/ProMedia.**

З НАТУРЫ

## "Я посторонним дверь не открываю!"

Калі чалавек, які прыехаў у Беларусь з іншай краіны, глядзіць БТ, ён вельмі здзіўляецца рэкламнаму ролику пра бабулю, што спачатку глядзіць "Санта-Барбару", а потым становіцца ахвярай рабаўніка, адчыніўшы дзверы. "Што, у вас суцэльны бандытызм?"

Мы, жыхары Беларусі, даўно прызвычаіліся да сцэнкі, якую паказваюць штодзённа на працягу паўгода. Але толькі калі мы сталі членамі ініцыятыўнай групы па зборы подпісаў за магчымага кандыдата ў прэзідэнты, зразумелі, чаму на БТ раз-пораз паўтараецца гэты ролік. І сапраўды: не раз і не два на наш званок і запрашэнне (праз дзверы) паставіць подпіс, чулі знаёмае па тэлероліку: "Я посторонним дверь не открываю!"

Цікавыя назіранні: заходзілі ў кватэру, дзе жыве інтэлігентная сям'я, і, пачуўшы прозвішча аднаго з дэмакратычных прэтэндэнтаў у кандыдаты, там адразу давалі згоду падпісацца. Узяўшы ў рукі пашпарт, дзе стаяць шматразовыя візы (штампы) у замежныя краіны, разумееш, што гэты чалавек, які бачыў дэмакратычнае грамадства ўвачавідкі, не толькі сам паставіць подпіс, а і параіць гэта зрабіць сваім блізкім.

Запомніліся некалькі сустрэч з людзьмі, якія былі ў выбарчых камісіях на рэферэндуме 1996 года. Адзін з іх катэгарычна заявіў, што нічога зараз падпісваць не будзе, бо не верыць, што адбудуцца справядлівыя выбары, а прэзідэнтам усё роўна застанецца А.Р. Субяседнік прызнаўся, што на працягу амаль трох гадоў пасля таго рэферэндуму баяўся, што прыйдзецца несці крымінальную адказнасць за ўсё, што рабілі члены выбарчых камісій, па загаду зверху ўтвараўшыя безліч фальсіфікацый.

Адзін з падпісантаў параіў добра падрыхтавацца назіральнікам на гэтых прэзідэнцкіх выбарах, бо вельмі шмат залежыць ад іх. У канцы размовы ён сказаў:

— Пасля таго, што я ўбачыў, будучы ва ўчастковай камісіі-96, я ніколі больш туды не пайду.

Маладыя людзі ахвотна ставілі свае подпісы за нашага прэтэндэнта. А лукашэнкаўскі электарат (гэта не навіна) — надзвычай агрэсіўны, злосны: вінаваціць у сваіх бедах каго заўгодна — бізнесменаў, Захад, апазіцыю. Толькі не яго, свайго куміра. Бяззубыя жанчыны ў паношаных сукенках і стаптаным абутку гатовы кідацца на цябе, абараняючы адзінага і незаменнага...

І міжволі ўспамінаюцца словы М.Багдановіча, напісаныя на пачатку стагоддзя:

*Народ, беларускі народ,*
*Ты — цемны, сляпы, нібы крот...*

**Алена БУРАК,**
**Мінск.**

КОЛОНКА ЮРИСТА

*Олег ВОЛЧЕК, автор рубрики, ждет ваших вопросов*

## Хочу продать дом

**Можно ли продать дом гражданину России?**

**Степанова Е.А., г. Минск**

В соответствии с Жилищным кодексом Республики Беларусь и Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 31.08.1993г. № 589 (с изменениями и дополнениями) иностранные граждане и лица без гражданства, постоянно проживающие в Республике Беларусь и занимающиеся на законных основаниях трудовой, хозяйственной или иной деятельностью, вправе приобретать квартиры (дома) по договорам купли-продажи в любых населенных пунктах Республики Беларусь.

Для оформления документов обращайтесь в Администрацию (исполком) по месту нахождения вашего дома.

## Льготы и налоги

**Кто имеет право на льготы по налогообложению доходов в виде наследства?**

**Герасимович Г.А., г. Минск**

В соответствии с пунктом 3.1.13. Приказа Государственного Налогового Комитета Республики Беларусь от 6.04.1999г. № 62 "Об утверждении методических указаний по исчислению и уплате подоходного налога с физических лиц" (с изменениями и дополнениями) не подлежат налогообложению доходы в виде наследства, получаемые наследниками:

— детьми (в том числе усыновленными);

— супругом (супругой);

— родителями (усыновителями) умершего;

— ребенком умершего, родившимся после его смерти;

— родными братьями и сестрами умершего, его дедом и бабкой как со стороны отца, так и со стороны матери;

— внуками и правнуками (в случае, если они являются наследниками по закону);

— иждивенцами, получившими обязательную долю в наследстве.

## Имеешь транспорт — застрахуйся

**Расскажите об обязательном страховании автотранспорта.**

**Марков С.В.,**
**Гомельская обл. г. Калинковичи**

Декретом Президента РБ от 19.02.1999г. № 8 "Об обязательном страховании гражданской ответственности владельцев транспортных средств" введено обязательное страхование гражданской ответственности транспортных средств. По данному виду обязательного страхования, страхуется ответственность владельца транспортных средств за вред, причиненный транспортным средством в результате дорожно-транспортного происшествия жизни или здоровью физических лиц, их имуществу, либо имуществу юридических лиц. Владельцы транспортных средств(автомобилей легковых и грузовых, автобусов, троллейбусов, трамваев, мотоколясок, мотоциклов, мотороллеров, специальных автомобилей, тракторов, прицепов и полуприцепов к этим транспортным средствам, подлежащим государственной или ведомственной регистрации и используемых в дорожном движении Республики Беларусь), обязаны в установленном порядке заключить со страховой организацией, имеющей лицензию на проведение обязательного страхования гражданской ответственности владельцев транспортных средств и являющейся членом Белорусского бюро по транспортному страхованию, договор обязательного страхования гражданской ответственности владельцев транспортных средств, по каждому эксплуатируемому транспортному средству.

## Не менее трехкратного заработка

**Какая сумма пособия при увольнении по сокращению штата?**

**Санаров С.В., г. Минск**

В соответствии со ст.ст. 48, 77, 78, 79 Трудового кодекса Республики Беларусь, при прекращении трудового договора в связи с ликвидацией организации, осуществлением мероприятий по сокращению численности или штата работников, прекращением деятельности индивидуального предпринимателя выплачивается выходное пособие в размере не менее трехкратного, а в связи с эвакуацией, отселением либо самостоятельным выездом из зон эвакуации, первоочередного и последующего отселения вследствие катастрофы на Чернобыльской АЭС — не менее четырехкратного среднемесячного заработка.

При увольнении работника все выплаты, причитающиеся ему от нанимателя, производятся в день увольнения. Если работник в день увольнения не работал, то соответствующие выплаты должны быть произведены не позднее следующего дня после предъявления им требования о расчете.

В случае спора о размерах выплат, причитающихся работнику при увольнении, наниматель обязан в указанный в части первой настоящей статьи срок выплатить неоспариваемую им сумму. Заработная плата, не полученная ко дню смерти работника, выдается членам его семьи или лицам, находившимся на иждивении умершего на день его смерти.

В случае невыплаты по вине нанимателя причитающихся при увольнении сумм работник имеет право взыскать с нанимателя средний заработок за каждый день просрочки.

При задержке выдачи трудовой книжки по вине нанимателя работнику выплачивается средний заработок за все время вынужденного прогула, и дата увольнения при этом изменяется на день выдачи трудовой книжки.

МЫ И МИР

# В Беларуси нет свободы слова,

## - утверждается в докладе Всемирной кампании за свободу слова "Артикль 19"

**Недавно достоянием гласности стал очередной доклад Всемирной кампании за свободу слова "АРТИКЛЬ 19" под названием: "Беларусь: механизм репрессий. Препятствия на пути к свободным и честным выборам в Беларуси". Попытка представителей этой международной организации презентовать свой Доклад оказалась неудачной. Как сообщалось, белорусские власти окончательно отказали им во въездных визах. Это привело к отмене презентации Доклада.**

**Что же написали эксперты "АРТИКЛЯ 19"?**

Изучение объемного текста Доклада показывает, что он едва ли доставил "радость" белорусской официальной стороне. В нем констатируется дальнейшее ухудшение ситуации в отношении свободы выражения мнения и отмечаются многочисленные попытки властей подавить деятельность негосударственных печатных СМИ.

Доклад содержит подробный анализ ситуации со СМИ в Беларуси, включая принятие дополнений в Закон о печати в декабре 1999 года. Много места в нем уделяется репрессивным мерам, предпринимаемым властями против газет. Однако акцент в Докладе сделан на правовых препятствиях на пути к свободным и честным выборам. Отмечается, что в Беларуси практически не существует доступа оппозиции к финансируемым государством СМИ. То, что белорусские власти преподносят как благодеяние — право на бесплатное появление кандидатов в депутаты (кандидатов в Президенты Республики Беларусь) на государственном ТВ и радио — в Докладе называется пережитком прошлого. В европейских странах кандидаты могут свободно покупать эфирное время. Только были бы деньги.

Международные эксперты подвергают критике положения действующего законодательства, которые устанавливают ответственность за клевету или оскорбление чести и достоинства президента и других высокопоставленных официальных лиц. По их мнению, это грубое посягательство на свободу выражения мнения. Еще в 1986 году Европейский суд по правам человека своим решением по делу Лингенс против Австрии заявил, что политики "сознательно и неизбежно подвергают (себя) открытому и пристальному вниманию к каждому своему слову и действию со стороны журналистов и широкой общественности ... и как следствие этого (они) должны демонстрировать более высокую степень терпимости, чем обычные члены общества". Далее Суд признал, что политики обладают правом защиты своей репутации, но "требования подобной защиты должны быть выдвинуты в отношении интересов открытого обсуждения политических вопросов".

Особую критику экспертов вызвал законопроект об информационной безопасности. Как отмечено в Докладе, он находится в явном противоречии с конституционными и международными обязательствами Республики Беларусь по отношению к свободе выражения мнений, поскольку предполагает практически полный контроль государства над информацией во всех сферах жизни.

Весьма интересно, что требование указанного законопроекта о распространении исключительно "полной, точной и своевременной информации" отклонено многими национальными судами. Оно рассматривается как дополнительный инструмент для фильтрации и ограничения информации, доступной общественности. По мнению экспертов, такое требование налагает тягостную ношу на журналистов для выполнения более чем жестких требований к точности. В любом случае это явилось бы серьезным препятствием в отношении свободы прессы.

Эксперты "АРТИКЛЯ 19" предлагают белорусским властям отклонить законопроект об информационной безопасности, поскольку он подвергает большому риску основное право на свободу выражения мнения, а также на получение и распространение информации.

В Докладе достаточно подробно описан механизм репрессий в Беларуси. Это — исчезновение известных общественных деятелей, включая оператора ОРТ Дмитрия Завадского; безосновательные предупреждения в адрес независимых изданий, которые критикуют власти; произвольные налоговые проверки, которые являются своеобразными карательными актами со стороны властей; подрыв полиграфической базы путем экспроприации частных типографских станков; дискриминация в сфере установления тарифов на распространение печатной продукции; фактический запрет на рекламу в негосударственных изданиях; препятствия с арендой помещений; и не основанная на законе перерегистрация негосударственных газет; кражи со взломом, которые с завидным постоянством случаются в офисах негосударственных газет и организаций.

Европейцы "прописали" белорусским властям полезные советы, как исправить ситуацию в сфере СМИ и обеспечить подлинную свободу выражения мнения и информации. Рецепты эти простые и понятные. Вот только некоторые из них: 1) власти должны уважать право СМИ и журналистов свободно и беспрепятственно передавать информацию по всем вопросам, представляющим интерес для общества; 2) ни одному журналисту не должно быть отказано в возможности заниматься профессиональной деятельностью; 3) ни одно СМИ не должно быть ликвидировано, не должна быть даже временно прекращена его деятельность; 4) ни одному СМИ не должно быть отказано в регистрации; 5) ни одному СМИ не должны мешать осуществлять печатание изданий или отказывать в доступе к информации на основании содержания их публикаций или природы определенного органа СМИ; 6) не должно существовать ограничений на содержание сообщений, случаи же ограничений должны быть четко определены и вводиться в особых целях, в соответствии с международными нормами о правах человека; 7) правительство должно предпринять безотлагательные шаги, чтобы уменьшить существенное преобладание государственных печатных СМИ, а также создать среду для свободной работы всех составляющих СМИ.

В общем, в Беларуси остается еще много проблем со свободой слова, и ситуацию в этой сфере надо кардинально улучшать.

*P. S. Текст Доклада уже "гуляет" на информационных просторах страны как на английском, так и на русском языках. Автор Доклада — Малкольм Хокс. Вы можете с ним связаться по электронной почте malcolm@hawkes.com и по телефону: +44 777 933 7130. А если хотите получить экземпляр доклада, то связывайтесь с представителем "АРТИКЛЯ 19" в Беларуси Софией Пагсли (sophia_pugsley@yahoo.co.uk, тел: 8 029 623 81 08) или смотрите www.article19.by).*

**Михаил ПАСТУХОВ,**
**доктор юридических наук,**
**руководитель Центра правовой защиты СМИ при ОО "Белорусская ассоциация журналистов".**

*Минский городской панк.*

**Фото IREX/ProMedia.**

ЧУЛІ?

## Значна горш, чым летась

Забяспечанасць сельскагаспадарчых прадпрыемстваў Беларусі палівам значна горшая, чым летась.

Па звестках Міністэрства статыстыкі і аналізу Беларусі, у першым паўгоддзі ў гаспадаркі паступіла на 13 працэнтаў меней дызельнага паліва і на 26 працэнтаў меней бензіну, чым за першыя шэсць месяцаў мінулага года. Найменшы ўзровень паставак дызпаліва ў Брэсцкай і Магілёўскай абласцях (адпаведна 82 і 84 працэнты ад узроўню мінулага года), бензіну — у Магілёўскай і Гомельскай абласцях (69 і 71 працэнта).

**Дзмітрый УЛАСАЎ.**

## Дзе самы высокі ўзровень беспрацоўя?

На 1 ліпеня гэтага года ў Беларусі афіцыйна зарэгістравана 99 тыс. беспрацоўных, што складае 2,2 працэнта эканамічна актыўнага насельніцтва. Паводле звестак Міністэрства статыстыкі і аналізу, гэта на 7,8 працэнта больш, чым на 1 ліпеня мінулага года (тады ўзровень беспрацоўя складаў 2 працэнты эканамічна актыўнага насельніцтва ).

Найбольшы прырост беспрацоўя зафіксаваны ў Брэсцкай (на 22 працэнты, да 12,5 тыс. чалавек), Віцебскай (на 11,1 працэнта, да 16 тыс. чалавек) і Гомельскай (на 8,3 працэнта, да 18 тыс. чалавек) абласцях. Самы высокі ўзровень беспрацоўя ў Магілёўскай (2,9 працэнта), Віцебскай (2,8) і Гомельскай (2,7) абласцях.

**Дзмітрый УЛАСАЎ.**

ГОРЬКО

# Мы были малолетними рабами...

В далекие уже 30-е годы бесчеловечным сталинским репрессиям подвергались не только тысячи и тысячи всевозможных "врагов народа" — от умелого, трудолюбивого крестьянина до известного писателя, а и их дети, вовсе уж ни в чем не повинные и разделившие страшную участь родителей. Они, переселенцы из родных мест на Север и в Сибирь, первыми умирали от голода и холода. А те, кто выжил, унаследовали "клеймо" своих родителей: пометка "из репрессированной семьи" преследовала их всю жизнь, калечила судьбы.

Мне довелось испытать это на себе в военные и первые послевоенные годы. Мы, 12—13-летние дети, должны были работать под присмотром коменданта на лесоразработках, на заготовке кормов с выездом далеко за **ПРЕДЕЛЫ** поселения (иначе бы не выдали паек — 300 г. хлеба). В ГУЛАГовском совхозе мы вместе с заключенными растаскивали по полям удобрения, пололи посевы. Нас, правда, раз в день кормили. Но — не платили ни копейки. Разве это было не настоящее рабство, не эксплуатация детского труда по-социалистически?

Теперь, слава Богу, малолетние и взрослые узники фашистских концлагерей за свой принудительный труд получат денежную компенсацию от сегодняшней, демократической Германии. А кто в сегодняшней лукашенковской Беларуси вспомнил о нас, перенесших по вине советского государства (сути которого Лукашенко свято придерживается) нечеловеческие страдания и оставшихся в старости ни с чем? Разве что со своими горькими воспоминаниями, хотя и трудились мы во имя сладкой, обманчивой сказки по имени коммунизм...

**З.СЕНЬКО, строитель 2-й ветви Северо-Печорской железной дороги, Красноярской и Братской ГЭС, г.Мозырь.**

# Хакеры,

## ці Пра электронныя эканамічныя злачынствы

Злодзей з чамаданам долараў — гэта, кажуць спецыялісты, ужо ўчарашні дзень. Адыходзяць у мінулае налёты на банкі і інкасатараў. Сёння дастаткова сесці за камп'ютэр, каб перавесці вялізныя сумы грошай з аднаго банка ў другі. Нават з аднаго кантынента на другі. Інтэрнэтаўскія вундэркінды навучыліся ўмела абыходзіць паролі і іншыя сістэмы абароны ў камп'ютэрных сетках і могуць даволі хутка выкрасці ў банках сотні тысяч долараў і перавесці іх на рахункі падстаўных асоб.

Словам, з імклівым ростам Інтэрнета і электроннага бізнесу — гэтай надзеі на вялікі прагрэс, набірае моцы і хваля ўзломаў сайтаў і сервераў. Амаль штодзённа паступаюць паведамленні аб атаках хакераў, гэтых сучасных машэннікаў і злачынцаў, на фірмы. Іх не пужаюць нават самыя надзейныя электронныя коды. Здаецца, ніякая мудрагелістая абарона не можа ўстаяць пад націскам іхняга інтэлекту.

Зранку, калі спецыялісты амерыканскай кампаніі Aastrom Bioshiences выйшлі на свой сайт, яны былі моцна здзіўлены. Там было паведамленне аб тым, што іхняя фірма ўваходзіць у фармацэўтычную кампанію Geron inc. Яны — да кіраўніцтва. А тое і не чула нават пра такое. Аказваецца, невядомы неяк пранік на сайт і размясціў такое паведамленне. Падобны жарт дорага абышоўся кампаніі. Яе акцыі моцна знізіліся, затое другой — значна выраслі. Так была праведзена ўдалая аперацыя з акцыямі дзвюх кампаній, на чым нехта добра пагрэў рукі.

У сваіх дзеяннях хакеры абганяюць нават фантазёраў. Помніце кінакамедыю "На Деребасовской хорошая погода, или На Брайтон-бич опять идут дожди"? У ёй, у самым пачатку размовы прэзідэнтаў СССР і ЗША Гарбачова і Рэйгана па звышсакрэтнай лініі, раптам урываецца ў размову нейкі Рабіновіч і гаворыць кіраўнікам дзяржаў, каб яны крыху пачакалі, бо ў яго тэрміновая размова з Адэсай, і таму ён займае іхнюю лінію. Стваральнікі фільма, відаць, не падазравалі, што нешта падобнае хутка здарыцца ў жыцці. Ішла віртуальная сустрэча прэзідэнта ЗША Клінтана са сваімі выбаршчыкамі. Яны задавалі па Інтэрнету пытанні, ён адказваў. І раптам... На пытанне: "Што прэзідэнт думае аб Інтэрнеце?" на экране з'яўляецца адказ: "Асабіста я хацеў бы бачыць больш парнаграфіі". І выбаршчыкі, і спецыялісты сайта — у недаўменні. Хутка тыя словы былі выведзены з экрана, і на іх з'явіўся адказ самога прэзідэнта. Спецыялісты да гэтага часу ламаюць галаву над тым, як невядомаму ўдалося пранікнуць на такі добра абаронены сайт.

Нядаўна хакерамі быў паралізаваны сайт "Онлайн-перакладчык". Яны абышлі пароль і ўнеслі змены ў праграму. У выніку на серверы былі спынены пераклады, а на ўсе запыты выдаваліся непрыгожыя словы, уведзеныя зламысніка мі. Такім чынам канкурэнту быў нанесены вялікі ўрон.

Ходзяць размовы аб высокай кваліфікацыі хакераў Расіі і Беларусі. Апошнія факты пацвярджаюць гэтую версію. Тэлеканал НТБ у праграме "Крымінальная Расія" нядаўна расказаў пра камп'ютэршчыка з Санкт-Пецярбурга, які змог з вядучага амерыканскага банка перавесці на рахункі сваіх саўдзельнікаў у Ізраілі, Амерыцы і Нідэрландах тысячы долараў. Вялікія сумы грошай з таго банка так імкліва ўплывалі ў розныя бакі, што ўся фінансавая сістэма ЗША аказалася на мяжы банкрутства. На пошукі зламысніка былі кінуты буйныя сілы ФБР на чале з намеснікам кіраўніка гэтай арганізацыі, а таксама спецслужбы Ізраіля, Расіі, Англіі, шэрагу іншых еўрапейскіх краін.

Не так даўно Беларусь наведалі высокакапастаўленыя прадстаўнікі праваахоўных органаў Злучаных Штатаў Амерыкі. Яны прасілі адшукаць беларускага хакера, які моцна дапякае сваімі ўзломамі шэрагу вядомых кампаній. Мінскія спецыялісты выйшлі на адну падазроную асобу, правялі вобыск, прааналізавалі файлы, даныя крэдытных картак і матэрыялы накіравалі за акіян.

Чым жа "праславіліся нашы беларускія хакеры? З такім пытаннем я звярнуўся да начальніка аддзела аператыўна-арганізацыйнай работы крымінальнай міліцыі Галоўнага ўпраўлення ўнутраных спраў Мінгарвыканкама Сяргея Іванавіча Новіка. З яго слоў відаць, што праваахоўныя органы Мінска найбольш дапякаюць не столькі хакеры, колькі іх малодшыя калегі кардэры, якія навучыліся ўмела падробляць крэдытныя карткі і такім чынам рабіць "закупкі" неабходных тавараў у зарубежных Інтэрнэт-магазінах.

Гады два таму паступіў сігнал з Канады. З тутэйшага Інтэрнэт-магазіна, з выкарыстаннем фальшывай крэдытнай карткі "закуплены" шэраг каштоўных тавараў. Сляды вядуць у Мінск. Аператыўнікі беларускай сталіцы, атрымаўшы запыт з-за акіяна, выйшлі на зламысніка, правялі вобыск на яго кватэры, у ходзе якога былі знойдзены каштоўныя рэчы, аб якіх паведамлялася з Канады. Электронным злодзеем аказаўся студэнт пятага курса політэхнічнай акадэміі. Ён "закупіў" і атрымаў з-за акіяна рэчаў на 13 тысяч канадскіх долараў. Аднак своечасова яго не ўзялі пад ахову, студэнт збег. Цяпер ён у вышуку.

У пачатку сёлетняга года прыйшоў зварот праваахоўных органаў Германіі аб выяўленні і затрыманні зламысніка, які з дапамогай падробленых крэдытных картак завалодаў рэчамі кампаніі "Фотаянк". Справа ішла аб выкраданні некалькі дзесяткаў лічбавых фотакамер агульным коштам амаль на 80 тысяч нямецкіх марак. У ходзе пошукавых работ было ўстаноўлена, што крадзяжом фотаапаратаў займаецца некалькі злачынных груп. На чале кожнай — малады, вопытны камп'ютэршчык. Кожны з іх меў шэраг падстаўных асоб, на якіх афармляў свае пасылкі з каштоўнасцямі. Яны іх атрымлівалі і перадавалі гаспадару, які аплачваў іхнія паслугі. У якасці падстаўных асоб былі школьнікі, пенсіянеры, беспрацоўныя, якія за невялікія сумы згаджаліся атрымліваць пасылкі на сваё імя. У цэлым у пяці групах было задзейнічана да сотні чалавек.

Чаму ж усе пяць груп выйшлі на адну кампанію "Фотаянк"? Як высветлілася, яе магазін у Інтэрнеце — новы. Каб прыцягнуць да сябе пакупнікоў, увялі спрошчаную сістэму афармлення пакупак. Вось гэта і прыцягнула злачынцаў, якія, нібы мухі да мёду, прычапіліся да спрошчанай сістэмы.

Электрычна-камп'ютэрнымі злачынствамі мінская міліцыя сур'ёзна займаецца апошнія гады тры. Найбольш ураджайным на набыткі аказаўся сёлетні год. З пачатку года ўжо ўзбуджана больш 150 крымінальных спраў супраць аматараў нажывы з выкарыстаннем камп'ютэрнай тэхнікі.

У судзе ж пакуль разгледжана толькі адна справа. Гэтая, можна сказаць, гістарычная падзея адбылася 7 чэрвеня сёлетняга года ў судзе Кастрычніцкага раёна горада Мінска. На лаве падсудных аказаўся студэнт эканамічнага універсітэта Аляксей Макееў 1980 года нараджэння, рускі.

Трэба адзначыць, што ўвагу міліцыі найперш прыцягнуў старэйшы брат Аляксея Міхаіл, камп'ютэршчык, які з дапамогай падробных крэдытных картак "закупляў" у Інтэрнет-магазінах ЗША, Аўстраліі, Новай Зеландыі, Германіі каштоўныя рэчы, якія затым прадаваў на аўкцыёнах. Алчуўшы нядобрае, ён збег, цяпер — у вышуку. А тлумачэнні аб агульных справах даваў малодшы брат, на якога была выдзелена і заведзена асобная справа. Вось шэраг фрагментаў з яго паказанняў у судзе.

Ён пражываў разам з маці і старэйшым братам, у якога быў камп'ютэр, і ён выконваў заданні для нейкай фірмы. У канцы 1998 года ці пачатку 1999-га брат папрасіў яго з'ездзіць у аэрапорт і атрымаць там тавар, які прыйшоў у лік аплаты за выкананую работу праз Міжнародную сетку Інтэрнет. Пры гэтым сказаў, з кім забраць тую пасылку і заплаціць названаму чалавеку 10 долараў. Выконваючы просьбу брата, Аляксей сустрэўся з незнаёмай Давідовіч С. паехаў у аэрапорт "Мінск-2", дзе яна атрымала пасылку на сваё імя. Аляксей забраў у яе пасылку, аддаў ён 10 долараў і на тым разышліся. Па наклейцы на пасылцы зразумеў, што ў ёй была карта з праграмным забеспячэннем. Ён яшчэ не раз выконваў падобныя просьбы брата.

А вось якія тлумачэнні давалі на судзе сведкі. Несцярэнка Е. паведамляла, што яна дала аб'яву ў газету "Из рук в руки", што шукае работу. Хутка ёй пазваніў мужчына, назваўся Міхаілам і прапанаваў працу — атрымліваць пасылкі яго фірмы ў аэрапорце "Мінск-2" і Галоўпаштамце, аплата — 10 долараў за кожную пасылку. Пры гэтым патлумачыў, што ў пасылках будуць прыходзіць у асноўным камплектуючыя для камп'ютэраў. Яна згадзілася. Ён узяў яе пашпартныя даныя, пакінуў тэлефон свайго пэйджэра. Пасля гэтага ішлі пасылкі на яе імя, яна атрымлівала іх і аддавала Міхаілу, атрымліваючы ўзамен па 10 долараў.

Сведка Дуброўская расказвала, што ад сяброўкі яна даведалася, што тая па аб'яве ў газеце знайшла добрую работу — атрыманне пасылак за 10 долараў. Прапанавала свае паслугі. Хутка пазваніў Міхаіл і прапанаваў ёй працу.

Такім чынам рос спіс падстаўных асоб. Пасылкі ішлі з многіх штатаў Амерыкі — Пенсільваніі, Каліфорніі, Верджыніі... У іх прыбывалі ў Мінск міні-камп'ютэры, сканеры, модулі аператыўнай памяці, абутак, рыбалоўныя катушкі, радыётэлефоны, працэсары, накапляльнікі на магнітных дысках...

Ішла дзелавая перапіска "Ваш заказ атрыманы, — паведамляў Цім Барфелд з кампаніі "Боббі Дэнніг". — Праігрывацель будзе адпраўлены Вам 22 сакавіка. Раскажыце пра нас вашым сябрам. Дзякуй яшчэ раз за заказ". А вось пісьмо з Нью-Джэрсі: "Паважаны пакупнік. Дзякуем Вам за пакупку. Калі Вы захочаце абмеркаваць з намі чарговы Ваш заказ, дык мы з задавальненнем абслужым Вас".

За кароткі час браты атрымалі рэчаў амаль на 24 тысячы долараў. Асноўны махінатар Міхаіл, як ужо гаварылася, збег і знаходзіцца ў вышуку. Малодшы брат Аляксей атрымаў чатыры гады пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці. Суд улічыў яго раскаянне, малады ўзрост, станоўчую характарыстыку.

Мне цяжка даваць ацэнку суду, і я не збіраюся гэтага рабіць, але не магу прамаўчаць аб асабістым уражанні ад гэтай справы. З яе вынікае, што аперацыі з пасылкамі праводзіў старэйшы брат Міхаіл. Малодшы брат Аляксей у асноўным атрымліваў пасылкі па просьбе брата. Ніяк не магу зразумець вось што. Калі кагосьці з нас папросіць брат ці іншы родзіч атрымаць нейкую пасылку і мы выканаем яго просьбу, дык у чым тут крымінал?

**Іван МАКАЛОВІЧ.**

*(Заканчэнне будзе.)*

Народная Воля
2 ЖНІЎНЯ 2001 г.

ДАЙДЖЕСТ

## Милошевич встретился с бывшим министром юстиции США

Находящегося в тюрьме ООН в Гааге бывшего президента Югославии Слободана Милошевича посетил бывший министр юстиции США Рамсей Кларк. Встреча состоялась по просьбе Милошевича и продолжалась около двух часов.

Кларк не выступал в роли адвоката бывшего президента СРЮ, а прибыл как частное лицо с целью оказания ему юридической помощи.

73-летний Рамсей Кларк является одним из самых известных в США противников операции НАТО против Югославии. Бывший министр юстиции в администрации Линдона Джонсона не считает законным и создание Международного трибунала для бывшей Югославии, равно как и выдачу ему Слободана Милошевича.

**РИА "Новости".**

## Демонстранты забросали брокеров орехами

Во Франкфурте демонстранты вломились в здание биржи после того, как они облили находящуюся перед зданием знаменитую статую "Бык и Медведь" розовой краской. Около 200 демонстрантов ворвались в главный холл биржи, а 20-ти из них удалось проникнуть на торговую площадку. Демонстранты забрасывали работников биржи орешками, которые должны были символизировать деньги. Таким образом демонстранты желали выразить свой протест против неадекватных денежных компенсаций людям, чей рабский труд использовался в нацистской Германии. "Деньги — это орешки, которые мы бросаем в лицо брокерам," — заявил один из демонстрантов.

Протестующие были выдворены из здания в течение 10 минут. Работа биржи их появлением прервана не была.

**"Ассошиэйтед Пресс".**

## Трибунал в Гааге осудил боснийского серба за геноцид

Международный трибунал в Гааге приговорил к 10 годам лишения свободы боснийского серба Стефана Тодоровича по обвинению в преследовании хорватов и мусульман в городе Босанский Самач на севере Боснии. Стефан Тодорович являлся начальником полиции местного муниципалитета. В результате масштабных этнических чисток, проходивших в 1992-1993 годах, в городе из 17 тысяч хорватов и мусульман осталось лишь 300 человек — остальные были убиты или изгнаны.

Тодорович признал себя виновным в убийстве, пытках и проявлении сексуального насилия. Прокуроры требовали для обвиняемого 12 лет тюрьмы, адвокаты — пять. Судья Патрик Робинсон заявил, что трибунал принял во внимание смягчающие обстоятельства: признание Тодоровичем своей вины, раскаяние в совершенных преступлениях и сотрудничество со следствием и трибуналом, в частности, дача показаний по делам других обвиняемых.

**"N-TV", Германия.**

## Развод Тома Круза и Николь Кидман узаконен

**На снимке: А счастье было так близко.**

**"Рейтер".**

Чиновник верховного суда города Лос-Анджелес сообщил, что судья Ли Эдмон подписал бумаги, согласно которым бракоразводный процесс Тома Круза и Николь Кидман будет завершен через неделю, 8 августа. Фактически, решение суда означает формализацию развода двух звезд американского кино. Остается уладить лишь вопросы совместной собственности. Напомним, что Том Круз подал прошение о разводе в феврале с.г. после того, как прожил вместе с Николь Кидман 10 лет. Возможно, одной из причин развода стало знакомство Круза с 27-летней актрисой Пенелопой Круз.

## В зоопарке штата Флорида тигр насмерть загрыз человека

В американском штате Флорида тигр, неожиданно вырвавшись из клетки, до смерти загрыз служащего зоопарка Savage Kingdom. Сообщается, что 49-летний мужчина вошел в вольер животного для проведения ремонта, когда 250-килограммовый тигр сибирской (амурской) породы выскочил наружу сквозь прутья заграждения. Мужчина скончался моментально от травм шеи и головы. В дальнейшем животное было застрелено охранником парка Робертом Бауди. Известно, что в марте 1997 года произошел подобный инцидент, в котором был серьезно ранен один рабочий зоопарка.

## Ирак оставляет за собой право атаковать американские самолеты

Ирак оставляет за собой право сбивать американские самолеты, пролетающие над иракской территорией. Даже несмотря на возможность ответного удара, Ирак по-прежнему будет атаковать американские самолеты, заявил министр иностранных дел страны Наджи Сабри.

"Американцы — это агрессоры, и они должны ответить за свои действия. Это у Ирака, а не у Вашингтона есть право на ответный удар," — говорит Сабри. По мнению Сабри, Вашингтон прибегает к силе, когда Ирак борется за свои права, независимость, суверенитет и интересы. Бороться с вражескими самолетами — законное право любого государства. У Ирака есть право защищать себя так, как ему позволяют средства, считает Наджи Сабри.

**"Франс-Пресс".**

ЛИКБЕЗ

# Восемь заповедей Жака Сегела

**Александр СИЛИЧ**

**Французский специалист по избирательным технологиям и политическим коммуникациям Жак СЕГЕЛА является ведущим в мире. Многие называют его — ни больше, ни меньше — "творцом президентов". И это не является преувеличением: с десяток лидеров европейских стран во многом обязаны своим приходом к власти блестящему искусству французского политтехнолога. Его мысли, наблюдения, суждения — порой самые парадоксальные — легли в основу азбуки политической рекламы, которые маэстро облек в восемь уроков, в восемь заповедей для организаторов избирательных кампаний.**

**Сегодня с этими заповедями мы знакомим читателей "Народной воли".**

*Я не знаю ничего более пьянящего, чем буря президентской кампании. Время останавливается, каждое мгновение кажется историческим. Малейшее решение становится значимым, самый скромный лозунг — приказом, самая бездарная эмблема — штандартом...*

*Жак Сегела.*

### Голосуют за человека, а не за партию

Живой пример — "человек-танк" Борис Николаевич Ельцин. Противопоставив себя в конце 80-х годов могущественной и единственной в СССР Коммунистической партии, Б.Н., тем не менее, победил. Средства массовой информации пошли на поводу великого политического актера и сделали из него "звезду", так ярко и контрастно выделявшуюся на фоне "глубоко удовлетворенной" и аморфной партийной массы. Ельцин делал вид, что ездит на общественном транспорте и ходит питаться в заводские столовые, в то время как его ожиревшие партийные бонзы с трудом и одышкой забирались в правительственные ЗИЛы.

Кстати, этот же важнейший принцип в свое время активно эксплуатировал и Александр Лукашенко, сыграв в нужное время и в нужном месте роль чертика из табакерки. И хоть он до сих пор на каждом углу продолжает твердить, что не принадлежит ни к одной из партий и, как всегда, остается с народом, народ-то видит, что партия у Лукашенко все-таки есть. Это партия чиновников — всем довольных и не таких спортивных, как батька, субъектов, предпочитающих городскому транспорту супердорогие джипы "Лексус", бронированные "Мерседесы-600" и другую технику, отдаленно напоминающую городской троллейбус типа ЗИУ.

Ау, беспартийный!

### Голосуют за идею, а не за идеологию

"Талисмана-наоборот" Владимира Заметалина знают все. Сначала главный идеолог Вячеслава Кебича "с успехом" провалил избирательную кампанию своего патрона, затем был призван под знамена нового рулевого — батьки Лукашенко. Григорьич, видимо, твердо решил последовать на выборах примеру своего предшественника. Что ж, туда ему и дорога, как говорится.

Игнорирует А.Г. одну вещь — не любит народ слащавых, надоедливых догм, которые подогнаны штатными идеологами под такую же слащавую и слишком правильную идеологию, с сонной "уверенностью" транслируемую по зависимым СМИ. Особенно нелепо вся эта сладкая ложь, на скорую руку придуманная в кабинетах Белорусского радио и телевидения, звучит на фоне всеобщего хаоса, фактического безвластия и беспомощности.

Избирателю нужна идея — четко сформулированная, спрессованная в несколько коротких формул-сообщений смесь, "испив" которую избиратель увидит в конце тоннеля свет, услышит в речах автора этой волшебной "смеси" решение всех его проблем, зарядится энергией планов кандидата. Идея должна звучать громко, уверенно и иметь грандиозные перспективы для Беларуси.

Жак Сегела писал: "Выборы — это не что иное, как встреча судьбы человека с ожиданиями нации".

Скорректируй свою судьбу, уважаемый успешный кандидат, и заставь ее соответствовать ожиданиям белорусской нации!

### Голосуют за будущее, а не за прошлое

Один мудрец сказал: "У народа нет ни памяти, ни признательности". В кабине для голосования избиратель не думает о достижениях или провалах нынешнего правителя, он думает о том, что с ним (избирателем) будет дальше.

Есть мнение, что Лукашенко выиграл президентские выборы 1994 года потому, что он пообещал вернуть страну в прошлое — в Советский Союз. Позволю себе не согласиться с такой точкой зрения: это потом, после избрания Лукашенко начал вовсю смаковать, эксплуатировать ностальгию старшего поколения к прошлому. Побеждал же он на выборах как народный защитник — "от зарвавшихся чиновников, кровожадных банкиров и бесчинствующих бизнесменов". Люди поверили истинному народному демагогу и понадеялись, что в БУДУЩЕМ он действительно поступит так, как обещал. Что из этого получилось, и были ли на самом деле бизнесмены бесчинствующими, а банкиры — кровожадными, вы и сами знаете...

В этой связи небезопасно, с моей точки зрения, альтернативному кандидату в своих выступлениях делать акцент на прошлом (а такие случаи порой наблюдаются в прессе) и использовать глаголы в прошедшем времени: "я сделал", "я пообещал", "так было" и т.д. Гораздо приятнее для уха избирателя будет услышать "я сделаю", "я обеспечу", "так будет".

У Рональда Рейгана как-то спросили: "Какой день самый счастливый в Вашей жизни?" "Завтрашний!" — не задумываясь, ответил американский президент.

### Голосуют за образ социальный, а не политический

Часто у нас говорят, что многие проблемы у Беларуси существуют оттого, что, мол, наше население индифферентно, т.е. безразлично к политике — не хотят люди массово в партии вступать, на демонстрации ходят всегда одни и те же, а остальные наблюдают за действом с балконов. Можно здесь, наверное, кое с чем согласиться и даже посетовать. Но хочу напомнить, что так называемое "болото", то есть обыватели — люди, которые делают выбор только в день голосования, и от мнения которых, в конечном счете, зависит имя нового президента страны, живут не только в Беларуси.

Если обратиться к мировому опыту, то известно, что большинству обывателей в любой стране (а не только в нашей) политика неинтересна, а многочисленные политические партии для них — не более, чем игра красок и направлений: зеленые, красные, левые, правые... Это факт, с которым не будет спорить никто. И такую способность массового сознания оценивать события с социальной точки зрения, а не политической, не может не учитывать кандидат-победитель. В любой стране. Беларусь — не исключение!

Избиратели голосуют сердцем, а не разумом, и их волнуют термины "моя безопасность", "мой дом", "моя семья", "моя машина" и т.д., а совсем не "политика", "резолюция", "конгресс" или, не дай Бог, "кворум". Об этом нельзя забывать.

### Голосуют за человека-легенду, а не за посредственность

Лех Валенса, Вацлав Гавел, Нельсон Мандела — Вам знакомы эти имена, уважаемый читатель, не правда ли? Когда Вы думаете об этих людях, Вы вспоминаете, скорее всего, не их президентскую должность, а то, что это люди-легенды. Гавел до своего президентства — известный в Чехии драматург-диссидент. Валенса — народный герой, не испугавшийся военного положения в Польше, введенного Войцехом Ярузельским, не сбежавший, как многие, за границу — стал, в конце концов, чуть ли не былинным героем. Мандела, как известно, провел свои лучшие годы в южноафриканской тюрьме.

Белорусским человеком-легендой в начале прошлого десятилетия имел все шансы стать Зенон Позняк. Если бы не ряд серьезнейших ошибок в планировании избирательной кампании (если такое планирование вообще было — **А.С.**), искренние, но абсолютно проигрышные статьи типа "О русском империализме", неспособность договориться с другим кандидатом Станиславом Шушкевичем, быть бы Позняку первым президентом Беларуси. Последний гвоздь в свой политический гроб Позняк вбил, эмигрировав за границу.

Вряд ли можно назвать демократических кандидатов в президенты Владимира Гончарика и Семена Домаша людьми-легендами. Однако две-три ярких акции в оставшийся до выборов месяц могут их к этому образу приблизить. Будьте самоотверженны, господа!

### Голосуют за судьбу, а не за обыденность

Выборы — это драматургия. Избирательная кампания — это спектакль. Хочет того или нет, кандидат на время своей агитации должен стать своего рода актером — настоящим актером, на "спектакль" которого народ повалит валом. Народ нужно зажечь, народ нужно увлечь, народ нужно убедить в искренности своих намерений.

Когда Жак Сегела познакомился в Париже с болгарином Желю Желевым, последний не произвел на него никакого впечатления: "круглое крестьянское лицо, замкнутость конногвардейца, клоунская прическа". Болгарин казался больше похожим на "театрального лакея, чем на будущего президента". Сомнения пиарщика №1 были развеяны сразу после того, как Желев произнес свою первую речь. Это был абсолютно зажигательный и искренний спектакль. "Способность воспламенить аудиторию и, вместе с тем, природная застенчивость — мощнейшее оружие агитации", — отметил в своем блокноте Жак Сегела.

Скажите, земляки мои, разве может наш избиратель увидеть хоть оттенок страсти в вялом выступлении в стиле "одобрямс" вросшего в свое кресло белорусского чиновника, включая самого главного? Сомневаюсь.

Зеркало в доме есть, господа демкандидаты? Члены семьи готовы послушать вашу речь, а затем оценить ее и высказать свои замечания? Тогда тренируйтесь! Время еще есть.

### Голосуют за победителя, а не за неудачника

Замечательная фраза замечательного француза: "На выборах победит тот, кого видят не чаще, а лучше". Кого мы видим и слышим чаще всего на наших голубых экранах, дорогие белорусы? Верно! Но переходит ли это количество в качество? Нет, нет и нет. Посмотрите, как реагируют ваши родные или знакомые, когда в передачу радио или ТВ-программу вдруг "врубается" быстро узнаваемый сиплый голос. Рука тут же тянется к переключателю с раздраженным возгласом: "Надоел!"

Ремарка "Надоел!" относится не к победителю, эта ремарка — к неудачнику. Человек, который буквально заболтал нацию за семь лет своего правления и, вместе с тем, не обеспечил абсолютно никакого улучшения жизни, воспринимается в массовом сознании как НЕУДАЧНИК. Кто-то сопровождает такое отношение к А.Г. враждебностью и парой-тройкой непечатных выражений, кто-то просто его жалеет: "не получилось, мол, у Сашки". Но ПОБЕДИТЕЛЕМ, осмелюсь утверждать, Лукашенко могут считать только 15-20% населения — его всепогодный и несгибаемый электорат.

Господин Гончарик! Выше голову! Говорите коротко, но убедительно, эмоционально, но не крикливо, уверенно, но не самоуверенно — в общем, так, как говорят победители.

### Голосуют за ценности подлинные, а не мнимые

Времена гитлеровского министра пропаганды Йозефа Геббельса, к счастью, уже миновали. Более информированный, более требовательный, глубоко вникающий в проблемы избиратель уже не даст ослепить себя словесным фейерверком. Жак Сегела пишет: "Избиратель ждет своего чемпиона, чтобы тот воплотил ценность, в которой он хотел бы раствориться".

У первого послевоенного президента Франции генерала де Голля такой ценностью было величие его страны, Михаил Горбачев воплощал открытость всему миру, перестройку коммунистической системы, Франсуа Миттеран просыпался каждое утро и ложился спать вечером со своей "спокойной силой", мятежный Джон Кеннеди на каждом углу повторял свои идеи о "новых рубежах".

У каждого политика во все времена была своя "фишка", своя торговая марка, которая помогала ему победить на выборах. Беларуси тоже необходимо срочно определиться накануне выборов со своей победной торговой маркой. Как в двух-пяти словах выразить всю боль, все нужды, все надежды белорусской нации? Может быть, нам помогут наши известные поэты и прозаики... Вы — нерв, вы — сердце, вы — душа нации. Что вы думаете по этому поводу?

### Заключение

Открою интересный факт: практически все избирательные кампании в Восточной Европе, в том числе в Польше, Венгрии и Чехии, Жак Сегела проводил бесплатно, а точнее, за свой счет. И рождение таких президентов как Йожеф Анталл, Вацлав Гавел и Александр Квасьневский произошло во многом благодаря искусству французского виртуоза политических технологий.

ЭВРИКА!

## Кот исцарапал хозяйку до смерти

Жизнь пожилой британки оборвал ее собственный персидский кот, который когтем повредил варикозную вену на ее ноге. Сиделка не смогла самостоятельно остановить начавшееся кровотечение, а приехавшая по ее вызову бригада "скорой помощи" смогла только констатировать смерть женщины.

## Молоком можно будет лечить рак

В скором времени может появиться специальное молоко, которое помогает организму справляться с инфекциями и опухолями. В ходе экспериментов было обнаружено, что конъюгированная линолевая кислота, содержащаяся в обычном молоке, стимулирует иммунную систему. Если ее содержание увеличить, молоко станет намного полезней.

## Накачивал стариков снотворным, чтобы выспаться

В Уэльсе состоялся суд над медбратом, который давал престарелым пациентам двойные дозы мощного успокаивающего препарата, чтобы те не беспокоили его по ночам и давали выспаться. За это судья приговорил его к трем месяцам тюремного заключения в дополнение к тем 12, что он уже получил за издевательства над стариками в другом доме престарелых.

## Грозит смертная казнь за фальшивый рецепт

Американскому врачу, который выписал незаконный рецепт на сильнодействующий препарат, предъявлено обвинение в предумышленном убийстве, так как его пациент умер от передозировки. В США впервые выдвигаются столь серьезные обвинения в подобном случае. Если врача признают виновным в убийстве первой степени, ему грозит пожизненное заключение или смертная казнь.

БЫВАЕТ И ТАКОЕ

## Харьковский бегемот атаковал купальщицу

В харьковском зоопарке бегемот напал на девушку, попытавшуюся искупаться в его бассейне. Пострадавшая желала освежиться в воде, но не заметила дремавшую там самку гиппопотама. Девушку спасли подоспевшие на крики работники зоопарка. Незадачливая купальщица была направлена в Харьковскую городскую клиническую больницу скорой помощи, где ей была сделана операция на тазобедренном суставе.

БЕЗ ГРЫФА "САКРЭТНА"

# Вырадак (споведзь наёмніка)

*Дванаццаць гадоў таму па журналісцкіх справах завітаў у Навагрудак. Пасяліўся ў невялічкім гатэлі. У двухмесны местачковы люкс засяліўся і другі пастаялец — моцна збіты дзяцюк сярэдніх гадоў, вадзіцель аўтобуса са сталіцы. Тыдзень возіць нейкую дэлегацыю ад міністэрства нашай шматпакутнай культуры. Госці на банкеце, а ён вольны да раніцы. Збольшага пазнаёміліся, пагаварылі.*

*Ноччу мяне разбудзіў дзіўны спалоханы крык. Не разумеючы ў чым справа, уключыў святло і ўбачыў суседа, які корчыўся на падлозе і бессэнсоўна крычаў...*

*Я разбудзіў суседа, адно запытаўшы:*

*— Што з табой? Які злыдзень даймае?..*

*Ён зірнуў на мяне і працадзіў глуха:*

*— Кітайцы сняцца каторую ноч запар, няхай на іх... Вайна, ліха на яе. З кітайцамі ваяваў, таму і сняцца.*

*— Ты што, на Даманскім служыў, там вайна з імі гарачая была? — недаверліва гляджу на кіроўца аўто.*

*— Але ж даманцы, которым пашчасціла жывымі застацца, даўно пенсію праядаюць.*

*— Які там Даманскі? — адазваўся сусед. — Мая вайна з кітайцамі была ў семдзесят дзевятым, калі кітаец на В'етнам савецкі папёр, кулакі часаліся.*

*— А пры чым тут мы, беларусы, ты ж не в'етнамец... — вырвалася ў мяне.*

*— А про добровольческие отряды минских волонтеров-пулеметчиков не слыхал? — неяк насмешліва запытаўся ён.*

*— Адкуль жа? У савецкіх газетах пра гэта не пісалі, — адказваю.'*

*— Твои советские газеты вместе с добропорядочной "Правдой" знаешь для чего использовались? Не писали? Чего захотел!*

*Ён на хвіліну замаўчаў, нібы вагаючыся, ці варта пра гэта гаварыць. Чорная справа, таемная, таямніцы ў нас вой як аберагалі... Махнуў рукой, рашыўся:*

*— Сон китайцы украли, уже не засну, слушай и не перебивай... Пора з души камень сбросить, хотя и вряд ли...*

*І ён пачаў доўгую споведзь пра сваю вайну з кітайцамі.*

### Пабіў морду жонцы — стаў добраахвотнікам

— Спаймалі мяне міліцыянты на плёвым дзеле. Урэзаў па храпе маёй ненагляднай жонцы, а яна гукнула міліцыю. Прыехалі хутка, скруцілі ліха і адвезлі ў райаддзел, увапхнулі ў акварыум — ёсць такі пакойчык з вялікім акном — пуленепрабівайка з пластмасы. Я быў паддаты, шумнуў. Мяне ў пяты вугал. Пяць міліцыянтаў у круг, а я ў цэнтр. Адзін цябе па галоўцы пагладзіць, а другі спінку пачэша і трэцяму перадае. А трэці ў вуха гвазданне — куранты зазвіняць. Са мной такі нумар не прайшоў. У мяне за плячыма дэсантура, берэт крапавы маю... Паклаў я ўсіх мянтоў, яйцы паадбіваў. Мужыкі тлустыя, як бабы, сваёй справы не ведаюць...

Далі б, канешне, і мне, ныркі паадбівалі б, другіх гукнулі, але... Вось тут і самае цікавае... Пакінулі мяне ў спакоі. Пад ручкі — і бай-бай да раніцы.

### Сакрэтны загад: кадры для В'етнама

Цяпер дакладна ведаю, што міліцыі спусцілі дырэктыву, каб падбіралі кадры, і не на гулянку, у джунглі. А ўранку мяне ветліва пад ручкі і да кента ў чорным плашчы. Той і кажа: ты малады, здаровы, прыгожы і вясёлы, жонка ў цябе — ого, а свецішь табе, ведаеш, колькі? Сем гадоў строгага рэжыму! Пяць служыбых людзей знявечыў! Выбірай: Аршанскі дом адпачынку з калючым дротам у тры метры і аховай з аўчаркамі? А таму падпісвай паперу і едзь у кругасветку. Грошы добрыя атрымаеш, вольным чалавекам будзеш, свет убачыш. І шмат пра што яшчэ спяваў салоўка з канторы, дзе глыбока бураць — не адкапаешся.

Падпісаў дагавор, як клятву Радзіме даў — ідзі ў вайсковы гарадок, спецнакапіцель за высокай агароджай. І ні кроку на волю, цябе няма і доўга не будзе. Апрацоўвалі нам мазгі паліттаварыны ў штацкім. Пагроза ад Кітая. Кожны пяты ў свеце — вузкавокі. А пад ружжо іхняя партыя можа гукнуць дзвесце мільёнаў з гакам. А калі кожнаму ружжо і мех патронаў — рушаць на саюз непарушных — тайга заплача, рэкі сібірскія спалохана павернуць назад. Дактары распраналі нас дагала, мацалі, слухалі, у кожную дзірку, дзе можна, дрот ад прыборчыкаў засоўвалі, — годзен да службы ў в'етнамскім войску.

Абрыдла бегаць па гарадку — хутчэй бы ў В'етнам. І праўда, колькі можна? І стралялі з кулямётаў, і з "калашнікавых", кідалі гранаты, кусалі дрот, рвалі фанерныя дамочкі, набівалі руку. Нават нейкую песню вучылі, в'етнамскую, рускімі літарамі накрэмзаную...

Як дабраліся да В'етнама, гаворка асобная. Напхалі нас пад завязь, як арыштантаў у чэрава велізарнага вайсковага самалёта. Усе былі добра паддатыя, спявалі, цешыліся. І праўда, кругасветка пачалася. І далячэлі. Была ўжо ноч. За тыдзень прыбіліся да в'етнамскай купы і добраахвотнікі з Тамбова, Варонежа, Курска... А каб усё расказаць пра джунглі, дня не хопіць. Там густыя туманы, растуць дзікія бананы, а вады наўкола па самы пуп. І пачварных казюрак процьма. І кожная хоча тваёй крыві пасмакаваць. Кармілі нас няблага, чаго ўжо там. Давалі і нос наквасіць. Гарэлка іхняя слабаватая, але калі пару пляшак засадзіць за "в'етнамскі" каўнер — пахарашэе. У кожнай пляшцы з гарэлкай змяя гасцюе, праўда. Тырчыць, як агрызак вяроўчыны. Змяіная атрута дух ваяцкі бадзёрыць.

Баб прывезлі — в'етнамак. Невысокенькія, як снапок, але нічога сабе, стараліся, мы ж байцы в'етнамскага войска. І прывозілі роўна столькі, каб кожнаму ваяру свае рэдуты браць. Нас узвод і в'етнамак столькі. Яны прыехалі да нас не на гулі, а з канцэртам, а як жа... Паспяваюць хвілін пятнаццаць для прыліку, трошкі паскачуць. А мы ўжо ўсіх пра сябе падзелім. Мне вунь тая грудастая, а табе — жапастая, а камузвода — сама кіраўніца ўдарнай спеўнай групы. Спевы скончаны, хап пяюху на моцныя дэсантныя рукі і... Нічога сабе дзеўкі, старанныя, бо на партыйнай рабоце. Ад нас нешта перападала, як прэміяльныя.

Пасля месячнай муштроўкі выдалі форму жаўнера в'етнамскай непераможнай арміі. Пагрузілі на бартавікі і павезлі ў несусветную глушэчу. Горача, дыхаць няма чым, есці хочацца, а плакаць і сумаваць прапар не даваў. Падлюка, макароннік непераможнага савецкага войска, у баях пасмакаваўшы радасць перамог... З намі ён не цырымоніўся. Калі што якое не пагонаму, дык хрась па сківіцах, юшку пусціць і ласкавым бацькоўскім словам на ўсю моц, палохаючы жыўнасць у джунглях, праспявае:

— Салагі, бандыты! Антыграмадскі злачынны элемент. Маці вашу, сукіны неданошаныя дзеці!

Ішоў доўгі непаўторны армейскі сленг, падсаладжаны арыгінальным рускім матам. Родам хахол Мікола Пахрыпчанка з запарожскіх стэпаў. Двухметровы гігант, асцерявялы, бязлітасны, нахабны, як белавежскі зубр.

— Я навучу вас, як свабоду любіць, — роў ён на усё наваколле, — за тугрыкамі прыперліся, ліхо вам...

І арыгінальна вучыў, як тую ж свабоду любіць, за якую і ён жывата не шкадуе. Па загадзе прапара мы распраналіся дагала. Усю амуніцыю скатвалі і перавязвалі папругай. Аўтамат са скаткай на галаву і ў балота арш. А там жыўнасць кішма кішыць. Ах, ты не пойдзеш? У прапара кулакі, што адбойныя малаткі. Уліе — і мамцы не пажалішся. Заганяе ў балота ўвесь узвод голых байцоў па самую макаўку, пакуль носам балотнае жыжы не хлебанеш. І стаіць узвод у балоце гадзіну, другую, пятую. Ноч стаялі. Да скону не забуду жахлівую ноч у балоце. Казюркі яйца абкусалі. Усё гэта звалася: выжыванне на мясцовасці. А калі ж нарматывы па выжыванні не выконваліся, прапар правучваў вінаваўцу пасвойму. Прывязваў голага байца да дрэва і абмазваў алеем. Прынада для машкаты, гнуса, вусеня. Гукай, баец, мамку! Прапар Пахрыпчанка ад тых здзекаў з наёмнікаў меў свой асаблівы кайф.

А быў яшчэ урок на выжыванне. Голы баец, але з адным нажом мусіў ісці на суткі ў джунглі. Харчуйся тым, што коўзаецца, поўзае, лятае. І што ты думаеш, жэрлі. І вусеня, і хрушчоў, і жаб. Жэрлі, каб не падохнуць ад голаду. Я і жывую змяю рассмакаваў, зубамі рваў, прызвычаіўся. Пасля стограмца і слізняк і вусень паядаліся, што салата. А яшчарка па смаку не горш за кураня. І сабак жэрлі, пад гарэлачку...

— Адкуль жа гэтыя глыбокія парэзы на целе — я паказаў на рубцы, а іх у былога наёмніка — не палічыць.

— Бамбукавы трыснёг востры, што лязо брытвы. Некалькі сутак амаль голы па джунглях бадзяўся, думаў — канцы аддам.

### Касьба на ратным полі

Гэта былі ягадкі, бо чакала нас крывавае жніво, работа баявая. Мы — усе ратныя кулямётныя байцы. Для кожнага з нас, кулямётчыкаў, мелася свая сабачая будка. Цікавая рэч, скажу шчыра. Перасоўны будан-дзот з металу, а па форме як узбекская цюбецейка. Увесь в'етнамскі ўчастак, па якім згодна з разведдадзенымі пойдуць кітайскія жаўнеры, быў набіты гэтымі будкамі, — ночка цёмная, праца ўтомная. Для кожнага кулямётчыка гатовы будан-дзот. Яміна, прыпасы жрачкі, вада, кулямёт і тысячы патронаў. За ноч в'етнамцы столькі натыркаюць гэтых металічных цюбецеекдзотаў, а добраахвотнікі і наёмныя кулямётчыкі пад ахоўай. Ноччу — туды, у дзот. Чакай світанку, калі ў ружовым тумане паддатыя кітайцы ланцугамі пабатальённа папруць на зямлю братняга нам в'етнамскага народа.

На світанні пачынаецца. Кітайскія ваякі ідуць. І, як учора, заўчора, тыдзень таму, — скопам, паддатыя, нешта крычаць страляючы з аўтаматаў куды папала, ідуць на ўбой, на смерць. А мяне пот працінае. Але хваляванне знікае, калі, ухапіўшыся за рукаяць кулямёта, націскаю на гашэтку. Кулямёт выплёўвае смяротны агонь. Я супакойваюся і, як тое было ўчора, заўчора, ужо анічога не чую і не бачу, я б'ю і б'ю. А кітайцы ідуць, бягуць, падаюць, курчацца ў перадсмяротнай агоніі. Я ўжо не думаю пра тых, хто гоніць гэтых кітайцаў на кінжальна-смяротны агонь нашых кулямётаў. І раптам цішыня. Праз шчыліну свайго кулямётнага будана бачу, як адступаюць кітайскія ваякі, а там іх сякуць з кулямётаў свае, кітайскія заградатрады...

Ён доўга маўчаў, нервова скамячыў папяросу ў пацяруху, пацягнуўся за новай, запаліў, зацягнуўся і глуха загаварыў:

— А плацілі нам за кожнага забітага кітайца па тры рублі.

